*У.І.Рынкевіч*

# ШЛЯХАМ ДУХОЎНАГА ЎЗЫХОДЖАННЯ: ДВА СТАГОДДЗІ БЕЛАРУСКАЙ СТАНКОВАЙ ГРАФІКІ

Мастацтва духоўнае па сваёй сутнасці. Гэта справядліва не толькі для сакральнага жывапісу, храмавай архітэктуры, але і для свецкага мастацтва. "Бог стварыў чалавека па вобразе і падабенстве сваім", – вучыць Біблія. Евангелле заклікае да выхавання высокіх маральных якасцей чалавека, і ў гэтай высакароднай задачы мастацтва выступае важным сродкам. Мастак, працуючы па сваім індывідуальным разуменні, часцей за ўсё не задумваецца, што вобраз і падабенства Тварца, увасобленыя ў розуме і сумленні чалавека, кіруюць душэўнымі рухамі і рукой майстра. Менавіта духоўнасць з'яўляецца ідэйным стрыжнем мастацкай творчасці, вышэйшым абгрунтаваннем этыкі і маральным крытэрыем ацэнкі мастацкага вобраза.

Графіка – азбука мастацтва. Прымітыўныя графічныя выявы старажытнага чалавека былі першай знакавай формай перадачы інфармацыі, якія распачалі доўгі шлях стварэння пісьменнасці праз піктаграмы і ідэаграмы да фанетычнага пісьма. Як сказаў святы Кірыл, стваральнік славянскай азбукі, “толькі словамі вучыць – недастаткова, гэта ўсё роўна, што пісаць па вадзе, – усё знікне”. Графічныя творы істотна змяніліся ў працэсе эвалюцыі, але і сёння яны па сутнасці застаюцца “пісьмёнамі” чалавечага быцця: апавядаюць аб падзеях сацыяльнай гісторыі і ўнутраным свеце чалавека, вучаць нас паважаць нацыянальную культуру і захоўваць духоўныя каштоўнасці хрысціянства.

Вытокі нацыянальнай графікі зыходзяць з мініяцюр рукапісных усходнеславянскіх кніг і гравюр беларускіх стара- друкаў. Змешчаныя ў іх выявы евангелістаў, Хрыста, Божай маці, сцэны з Новага Запавету заклалі ідэйна-маральную аснову і жанрава-тэматычную структуру графічнага мастацтва. Вынаходніцтва друкарскага станка садзейнічала развіццю кніжнай гравюры, што зрабіла графіку самым масавым і дэмакратычным відам выяўленчага мастацтва. Майстэрства гравёрства перадавалася ад майстра да вучня. У народзе друкаваная графіка шырока распаўсюдзілася ў выглядзе гравіраваных “святых карцінак”.

Паняцце “духоўнасць мастацтва” неаддзельна ад высокага выканаўчага майстэрства. Творчасць – нястомная праца душы, але

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

гэта толькі адзін бок справы. Увасабленне вобразнай задумы ў мастацкім творы патрабуе ад аўтара майстэрства, якое можа быць дасягнута толькі пры належнай прафесійнай падрыхтоўцы мастака. Вызначальнай падзеяй у развіцці беларускай графікі стала адкрыццё ў 1805 г. у Віленскім універсітэце на факультэце вольных мастацтваў кафедры гравюры. Менавіта гэты год можа лічыцца годам нараджэння беларускай прафесіянальнай, або “вучонай”, графікі. Пераход выяўленчага мастацтва з паўпрафесіянальнай на спецыяльна адукацыйную аснову азначыў пачатак якасна новага этапу ў эвалюцыі нацыянальнай мастацкай культуры. З гэтага часу беларуская станковая графіка распачала свой шлях як самастойная галіна мастацтва. Двухсотгоддзе яго мы будзем адзначаць у бягучым годзе.

На працягу XIX ст. пастаянна ўзрастаючую ролю ў адукацыйна-мастацкай сферы ў Беларусі адыгрывала Пецярбургская акадэмія мастацтваў. Дзесяткі яе выхаванцаў працавалі ў беларускіх губернях.

Духоўнасць увасаблялася ў творах графікі ў цеснай узаемасувязі рэлігійнай і свецкай тэматыкі. Высокімі мастацкімі якасцямі і адухоўленасцю характарызуюцца гравюры партрэтнага жанру: вобразы гістарычных асоб, універсітэцкіх прафесараў, дзеячаў культуры. Па сваім выканаўчым узроўні эстампы, створаныя мастакамі віленскай школы (М.Падалінскі, Г.Кіслінг) у тэхніцы медзярыту, параўнальныя з творамі прызнаных тагачасных майстроў рускай і заходнееўрапейскіх гравёрных школ.

Станковая графіка была цесна звязана з развіццём рэпрадукцыйнай тыражнай графікі, якая садзейнічала папулярызацыі нацыянальнага выяўленчага мастацтва. Дзякуючы літаграфіям "Альбома Віленскага", выдадзенага ў Парыжы, шырокую вядомасць набылі жывапісныя творы беларускіх мастакоў К.Русецкага, Я.Дамеля, І.Хруцкага.

Творы арыгінальнай графікі – натурныя накіды і замалёўкі – з'яўляюцца першым крокам да стварэння манументальных роспісаў, жывапісных карцін, эстампаў, скульптур, ключом для пранікнення ў сутнасць творчага працэсу і разам з тым маюць сваю мастацкую і гісторыка-этнаграфічную каштоўнасць. Высакароднасць думак адчувальна ў альбомных замалёўках Альфрэда Ромера, Антонія Каменскага, Станіслава Богуша-Сестранцэвіча, Напалеона Орды, дзе бытавыя сцэны і тыпажы прасталюдзінаў чаргуюцца з біблейскімі персанажамі, відамі прыроды і помнікамі старажытнай

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

беларускай архітэктуры. Малюнкі і эстампы мастакоў сведчаць аб засваенні станковай графікай значных прафесійных пазіцый у еўрапейскім графічным мастацтве XIX ст.

XX ст. стала для беларускага мастацтва часам выпрабавання духоўнай трываласці. Глабальныя сацыяльныя катастрофы карэнным чынам змянілі азначаны кірунак развіцця мастацтва. Больш чым паўстагоддзя беларуская графіка развівалася ў плыні агульных тэндэнцый савецкага мастацтва ва ўмовах штучнай ізаляцыі ад асноўных кірункаў развіцця сусветнага мастацтва. На шляху фарміравання нацыянальнай мастацкай школы ў графіцы адзначаліся глыбокія заняпады і ўздым творчай думкі.

Найбольшую абвостранасць супрацьстаянне хрысціян-скага светапогляду і пазіцыі афіцыйнага мастацтва набыло ў міжваенны перыяд. Падзеі 1917 г. амаль поўнасцю перарвалі сувязі выяўленчага мастацтва першай паловы XX ст. з гісторыка-культурнымі традыцыямі папярэдніх стагоддзяў. Духоўнасці была супрацьпастаўлена ідэалагізаванасць мастацтва сацыялістычнага рэалізму. У гэтых умовах некаторыя з таленавітых беларускіх мастакоў падаліся шукаць прызнання за мяжой, а лёс многіх дзеячаў мастацтва з тых, хто пачынаў свой творчы шлях яшчэ ў дарэвалюцыйны перыяд, аказаўся трагічным (Я.Мінін, Г.Змудзінскі, М.Касцялянскі, М.Шчакаціхін і інш.).

Ва ўмовах станаўлення новай, сацыялістычнай фармацыі графічнае мастацтва было ператворана ў моцны сродак ідэалагічнай прапаганды. Агітацыйнасць стала асноўнай рысай і крытэрыем адбору выставачных твораў графікі. Тыповымі сюжэтамі яе былі рэвалюцыйная барацьба, партыйныя з'езды, будоўлі сацыялізму і да т.п. Рэвалюцыйны фанатызм выцесніў са станковага мастацтва душэўнасць чалавечых адносін. Маладое пакаленне творцаў адаптавалася да жыцця па закону дваістай маралі, падзяляючы мастацтва на афіцыйнае і тое, што прызначалася “для душы”.

Многія графічныя работы так і не ўбачылі выставачных залаў, бо не адпавядалі прынцыпу ідэйнасці савецкага мастацтва. Тым не менш графічнае мастацтва ў гады таталітарызму не страціла свайго асноўнага ідэйнага стрыжня – духоўнасці. Творы малых жанраў – псіхалагічныя партрэты, гістарычныя і лірычныя пейзажы В.Волкава, А.Тычыны, А.Астаповіча, Л.Лейтмана, М.Тарасікава, якія ўсё ж дайшлі да шырокай публікі, – былі той сюжэтна-

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

вобразнай сферай мастацтва, дзе знаходзілі духоўнае паразуменне творца і глядач.

Тэма Вялікай Айчыннай вайны духоўна аздаравіла беларускае мастацтва, вярнула яго да асэнсавання сапраўдных каштоўнасцей жыцця, да вобразнага ўвасаблення перамогі дабра над злом. Крыкам душы, абпаляючым сэрцы, сталі дакументальныя натурныя малюнкі актаў зверства фашыстаў на беларускай зямлі Я.Краскага, М.Абрыньбы, М.Гуціева і іншых мастакоў-воінаў.

Рэпартажныя замалёўкі першага пасляваеннага дзесяцігоддзя адлюстроўвалі боль страт, радасць перамогі, веру ў адраджэнне мірнага жыцця. Разам з ваеннай тэматыкай у графічных творах пасляваеннага часу М.Марыкса, М.Бельскага, А.Волкава, А.Тычыны, Б.Малкіна набыла моц тэма мірнай стваральнай працы. Але і ў гэтай тэматыцы было нямала пампезных кампазіцый, у якіх сапраўдная крыніца перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне – сіла духу нашага народа – падмянялася геніяльнасцю правадыроў, адданасцю народа камуністычным ідэям. Апавядальнасць графікі з цягам часу саступіла месца вобразнаму абагульненню і сімвалічнасці ў асэнсаванні гістарычных падзей.

Найбольш спрыяльным часам у савецкі перыяд для развіцця беларускага выяўленчага мастацтва, у тым ліку і графікі, сталі 1960–1980-я гг. Эканамічны ўздым краіны і звязаныя з ім станоўчыя змены ў культурна-адукацыйнай сферы стварылі неабходныя ўмовы і актывізавалі працэс фарміравання нацыянальнай школы графікі. Вырашальным фактарам у развіцці выяўленчага мастацтва стала фарміраванне шматузроўневай сістэмы спецыяльнай мастацкай адукацыі з яе флагманам – Беларускім дзяржаўным тэатральна-мастацкім інстытутам (зараз Нацыянальная акадэмія мастацтваў). У мастацкае жыццё ўлілося шмат маладых таленавітых графікаў. Разам з традыцыйнымі для савецкага мастацтва тэмамі рэвалюцыі, Вялікай Айчыннай вайны, сацыялістычнага будаўніцтва ў графіцы ўсё мацней вызначаўся кірунак на нацыянальнае адраджэнне беларускай культуры. Высокі ўзровень графічнага мастацтва вызначылі працы А.Кашкурэвіча, Г.Паплаўскага, В.Шаранговіча, У. і М.Баса-лыгаў, Л.Асецкага, А.Лось, А.Паслядовіч, Л.Марчанкі і многіх іншых мастакоў.

Сёння ў станковай графіцы адбываецца складаны працэс пераасэнсавання ідэйна-эстэтычных пазіцый нацыянальнага мастацтва, пошуку сапраўдных ідэалаў прыгажосці. У канцы 80-х–90-я гг., калі пачалі знікаць міражы камуністычнага раю, агалілася і

надуманая тэндэнцыйнасць, ілжывая ідэйнасць савецкага мастацтва. Часовая разгубленасць, якая ўтварылася ў грамадскай свядомасці, адбілася ў графічных аркушах хаатычнасцю формаў і панаваннем вобразаў нізкіх інстынктаў. Разам з прывабнай тэхнічнасцю і натуралізмам у свядомасць гледача ўкараняліся бездухоўная пустэча, а часам і гнюсная разбэшчанасць духу. Асэнсаванне таго, што ў такой якасці творчасць не патрэбна грамадству, прыходзіла не адразу.

Станковы графічны твор – помнік свайго часу. Кожнае пакаленне пакідае свае культурныя помнікі ў манументах, палотнах, творах графікі. Станковыя творы ўвасабляюць аўтарскі роздум, філасофію, нават рэлігію ў шырокім сэнсе гэтага слова. Сёння творчай сталасці дасягнула пакаленне графікаў, якія нарадзіліся ў 50–60-я гг. (сярод іх У.Савіч, В.Славук, Р.Сітніца, Л.Алімаў, Ю.Якавенка і інш.). У іх творах знайшла ўвасабленне эстэтыка чорна-белага мастацтва пачатку трэцяга тысячагоддзя, адлюстраваліся сацыяльныя калізіі і ўзровень культурна-інтэлектуальнага стану грамадства.

Творчы працэс няспынны. Для маладога пакалення графікаў вельмі важна не страціць галоўны арыенцір творчасці, так добра выказаны ў словах хрысціянскага прапаведніка Аляксандра Меня: “Творчасць разнастайная, але галоўнае – стварэнне свайго духу. Гэта – вечная творчасць. Тое, што напісана на палатне, – толькі знак таго, што адбылося ў нас у сэрцы”.

БИБЛИОТЕКА БГУКИ